*Т. А. Самайлюк*

# БЕРАСЦЕЙСКІЯ ДРУКАРНІ XVI ст.: КРЫНІЦАЗНАЎЧЫ І ГІСТАРЫЯГРАФІЧНЫ АСПЕКТЫ

*Для падрыхтоўкі грунтоўнага даследавання гісторыі Берасцейскіх друкарняў, актуальнасць якога ўжо не можа сѐння нават абмяркоўвацца, рэканструкцыі іх дзейнасці у першую чаргу неабходны выяўленне і публікацыя гістарычных дакументальных крыніц, архіўных матэрыялаў, складанне зводнага каталога выданняў друкарняў з іх паэкзэмплярным апісаннем, выданне бібліяграфічнага паказальніка публікацый па тэме.*

*У дадзеным артыкуле пастаўлена задача зрабіць агляд ужо назапашаных публікацый дакументальных крыніц па гісторыі рэфармацыйнага руху, з якіх можна вылучыць звесткі пра дзейнасць Берасцейскіх друкарняў, каталогаў бібліятэк і калекцый, дзе адлюстраваны і экзэмпляры берасцейскіх выданняў, а таксама публікацый навуковых даследаванняў па тэме.*

## Дакументальныя крыніцы

Распрацоўку крыніц па гісторыі рэфармацыйнага руху ўвогуле і кніжнай культуры пратэстанцкага асяроддзя на тэрыторыі Беларусі ў XVI ст. нельга назваць дастатковай. Помнікі Рэфармацыі ў ВКЛ не сабраны і не выдадзены ў поўным зборы. Падчас контррэфармацыі значная колькасць кніг і дакументаў была знішчана. Як вядома, найбольшы росквіт Рэфармацыі прыпадае на 50–70-я гг. XVI ст., а ў другой палове XVII ст. яна прыходзіць у заняпад. Невялікая колькасць лютэранскіх і кальвіністкіх абшчын працягвае існаваць і зацікаўлена ў абароне сваіх правоў. Яны захоўвалі каралеўскія прывілеі на заснаванне збораў, сеймавыя пастановы і іншыя дакументы. Пасля далучэння Беларусі да Расійскай імперыі прававое становішча пратэстанцкіх абшчын абмяжоўвалася статутамі, зацверджанымі ўладай. Выданне ў 1905 г. маніфеста аб верацярпімасці дало пратэстантам магчымасць выдаваць сваю літаратуру і, адпаведна, вывучаць сваю гісторыю [121].

Так, з 1911 г. у Вільні, дзякуючы сумесным намаганням літоўскіх кальвіністаў, стала выходзіць серыя «Збор помнікаў польскай і літоўскай Рэфармацыі» (Вільна, 1911–1915) [1]. З самага пачатку серыя задумвалася ў наступным складзе: серыя 1 – прывілеі і даравальныя граматы, серыі 2–9 – акты сінодаў, серыі 10–12 – кнігі збораў Польшчы і Літвы [122]. Праект не быў завершаны,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

надрукаваны толькі чатыры кнігі. Аднак у серыі быў выдадзены ўнікальны экзэмпляр берасцейскай друкарні з Бібліятэкі Чартарыйскіх у Кракаве «Akta, tho iest sprawy Zbory krześciańskiego Wileńskiego, które się poczęli. R.P. 1557 Miesiąca Decembra Dnia 14» [1]. Дакумент змяшчае матэрыялы Віленскага сінода, якія сведчаць аб пачатку кальвінісцкага руху ў ВКЛ. У 1925 г. збор помнікаў быў перавыдадзены [2]. Два кампілятыўныя незавершаныя выданні Катэхізіса 1553/1554 г. Б. Ваявудкі надрукаваны Ф. Пуласкім у 1908 г. [3].

Наступным выданнем помнікаў Рэфармацыі была публікацыя ў Варшаве ў 1966–1997 гг. актаў пратэстанцкіх сінодаў у Польшчы [4]. У 1992 г. надрукаваны тэстаменты вядомых прадстаўнікоў кальвінізму ВКЛ XVI–XVII стст. [5].

Акрамя тэматычных выданняў крыніц, прысвечаных рэфармацыі ў ВКЛ, існуюць агульныя зборы дакументаў, якія маюць адносіны да канфесійнай гісторыі і кніжнасці XVI ст. Гэта справаздачы польскіх нунцыяў у Рым [6], лісты Ж. Кальвіна польскім і літоўскім рэфарматам [7]. Каралеўскія ўказы аб пратэстантах, сеймавыя пастановы і іншыя афіцыйныя дакументы аб правах «іншаверцаў» знаходзяцца ў агульных зборніках помнікаў беларуска-рускай і польскай гісторыі [8]. Крыніцамі вывучэння выступаюць і такія наратыўныя дакументы, як перапіска і творы саміх спавядальнікаў Рэфармацыі ВКЛ.

### Бібліяграфічныя крыніцы

Да цяперашняга часу дзейнасць Берасцейскіх друкарняў застаецца мала даследаванай у беларускім кнігазнаўстве. Гэта звязана ў першую чаргу з тым, што «...польскамоўным выданням берасцейскай і іншых друкарняў адмаўлялі нават у частковай прыналежнасці да беларускай культуры, што з’яўляецца як найменей абсурдным» [104]. Доўгі час кнігі, выдадзеныя лацінкай, лічыліся здабыткам польскай ці літоўскай культур і практычна былі страчаны для беларускага кнігадрукавання. Да сѐння ўвогуле вывучэнне кніг лацінскага шрыфту яшчэ не стала аб’ектам шырокага навуковага даследавання ў айчынным кнігазнаўстве [125].

Эфектыўнасць даследаванняў у значнай ступені залежыць ад рэпрэзэнтатыўнасці ў бібліяграфічных крыніцах рэпертуару выдавецкай прадукцыі друкарняў, а таксама ад паўнаты звестак аб знаходжанні экзэмпляраў выданняў у фондах кнігасховішч.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У Беларусі вельмі мала даведнікаў, якія б досыць поўна адлюстроўвалі беларускія кнігі, выдадзеныя на замежных мовах на працягу XVI ст. Такой спробай быў бібліяграфічны дапаможнік М. Васілеўскай «Беларусь у друку XVI ст.» [15]. Але ѐн мае свае недахопы і патрабуе значнай дапрацоўкі і перавыдання. У бібліятэках Беларусі захоўваецца не шмат асобнікаў Берасцейскіх друкарняў. Апісанне экзэмпляраў, якія знаходзяцца ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі (НББ), дадзена ў публікацыі Г. У. Кірэеевай [35]. НББ пачала працу па стварэнні ў аўтаматызаваным рэжыме зводнага каталога «Кніга Беларусі», які адлюстроўвае выданні XVI–XVIII стст. на замежных мовах [126], у тым ліку і берасцейскія выданні.

Некалькі экзэмпляраў Брэсцкай Біблii з кнігасховішчаў Пецярбурга і Масквы апісаны М. В. Нікалаевым [109, с. 287–289]. Гэтыя экзэмпляры захоўваюцца ў Расійскай дзяржаўнай бібліятэцы, Бібліятэцы Расійскай акадэміі навук, Расійскай нацыянальнай бібліятэцы і Архіве Ваенна-марскога флоту Расіі. Даследчык піша аб неабходнасці сістэмнага пошуку і рэгістрацыі захаваных паасобнікаў Брэсцкай Біблii па ўсім свеце. Па яго меркаваннях, гэта некалькі дзясяткаў экзэмпляраў [109, с. 288].

Найбольш поўна выданні Берасцейскіх друкарняў прадстаўлены ў польскіх бібліяграфічных крыніцах. Л. І. Збралевіч, аналізуючы польскія публікацыі, у першую чаргу называе Шымона Старавольскага і яго працу «Сотня польскіх пісьменнікаў, або Пахвалы і жыццяпіс ста знакамітых польскіх пісьменнікаў» (выдадзена ў Франкфурце ў 1625 г.) [9], дзе прыведзены звесткі аб пісьменніках XVI – пачатку XVII ст., і ў невялікіх артыкулах акрамя біяграфічных звестак, пералічаны некалькі тысяч рукапісных і друкаваных кніг [92, с. 134]. Асноўнай бібліяграфічнай крыніцай выяўлення берасцейскіх выданняў па сѐнняшні час застаецца «Bibliografia polska» Эстрайхераў [12]. Цэнтр даследаванняў польскай бібліяграфіі Эстрайхераў Ягелонскага ўніверсітэта падрыхтаваў электронную версію паказальніка, даступную ў Інтэрнэце, «Elektroniczna Baza Bibliografii Polskiej Estreicherow – EBBE» [84]. Пэўную інфармацыю можна атрымаць з дапаможніка «Bibliografia Literatury Polskiej» [14]. Выданні Берасцейскіх друкарняў з фондаў польскіх бібліятэк улічаны ў серыі каталогаў і бібліяграфічных даведнікаў «Палоніка» [13; 17–27]. Кнігі, якія захоўваюцца ў бібліятэцы Віленскага ўніверсітэта, адлюстраваны ў каталогу выставы «Early books of Lithuania: XVI–XVIII century»

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

[30], а ў бібліятэцы Літоўскай акадэміі навук – у каталогу «XVI–XVII a. Lituanika» [29]. Вядомы некалькі экзэмпляраў берасцейскіх выданняў у бібліятэчных зборах Германіі [28], Швецыі [31; 32], ЗША [33; 34] і Расіі [36; 37].

## Публікацыі

Аўтарамі адных з першых даследаванняў Рэфармацыі ў ВКЛ з'яўляюцца Станіслаў Любянецкі («Гісторыя Рэфармацыі ў Польшчы...») [61] і славуты гісторык, паэт, настаяцель евангелісцка-рэфарматарскага збору Анджэй Венгерскі (Andreas Vengerscius, 1600–1649). Апошні на с. 485 кнігі «Systema historico-chronologicum ecclesiarum Slavonicarum per provincias varias» (Utrecht, 1652) [77] пісаў пра масавы вываз Берасцейскай Біблії і іншых беларускіх пратэстанцкіх кніг карэннымі жыхарамі Расіі да сябе на радзіму [104, с. 170].

Наступная праца ў храналогіі – Кшыштафа Сандыуса «Бібліятэка анты-трынітарорум» (Амстэрдам, 1684) [10]. Цікавасць уяўляе пералік пратэстанцкіх друкарняў у Заслаўі, Бярэсце, Вільні і Любчы. Праца Сандыуса была перавыдадзена ў Польшчы ў 1967 г.

Далей у 1725 г. у Франкфурце – Лейпцыгу з'яўляецца выданне Самуэля Лаўтэрбаха «Арыяна-сацынізм у старажытнай Польшчы» [59].

Першыя крыніцы выкарыстоўваліся ў пазнейшых публікацыях. Так, Ян Даніэль Гофман у працы «Аб друкарнях, іх узнікненні і распаўсюджванні ў Польскім каралеўстве і Вялікім Княстве Літоўскім» [48] спасылаецца на творы Анджэя Венгерскага. Першы горад ВКЛ, аб якім згадвае Ян Даніэль Гофман, – Бярэсце. Дайва Нарбутэне піша, што аўтар здзіўлены тым, што ў горадзе, дзе расквітала жыццѐ жыдоў (дзейнічалі сінагога, акадэмія, дзе смагу ведаў задавальнялі яўрэі з Італіі, Маравіі і Сілезіі), не было друкарні, здольнай друкаваць яўрэйскім алфавітам. Між тым, – працягвае Гофман, – рэфарматы, дзякуючы клопатам і сродкам свайго апякуна – ваяводы віленскага Мікалая Радзівіла, побач з дзеючым касцѐлам і школай мелі друкарню, куды быў запрошаны працаваць з Кракава Бярнард Ваявудка. Ён жа ў 1563 г. надрукаваў знакамітую Біблію рэфарматаў на польскай мове [107, с. 164]. Акрамя таго, Гофман згадвае толькі аб 5-ці кнігах друкарні [107, с. 167].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На падставе прац А. Венгерскага і С. Любянецкага ў 1786 г. з’яўляецца нарыс па гісторыі рэфармацыйнага руху ў Польшчы і ВКЛ лютэранскага гісторыка Хрысціяна Фрыза [47].

Значнай крыніцай вывучэння рэфармацыйнага кнігадрукавання ў Беларусі з’яўляецца «Гісторыя польскай літаратуры» Фелікса Бянткоўскага [40], у першай частцы якой разглядаецца гісторыя літаратуры, тэорыя і гісторыя бібліяграфіі, прыводзяцца звесткі аб друкарнях і бібліятэках ВКЛ і Рэчы Паспалітай. Праца Ф. Бянткоўскага паўплывала на далейшыя даследаванні ў гэтай галіне.

Грунтоўным навуковым укладам у вывучэнне гісторыі рэфармацыйнага руху ў ВКЛ з’яўляецца двухтомная работа Юзафа Лукашэвіча, надрукаваная ў Познані ў 1842–1843 гг. [62]. У першай частцы манаграфіі выкладаецца гісторыя Рэфармацыі з пачатку XVI ст. да паловы XVIII ст., у другой – даецца гістарычны агляд збораў, школ, друкарняў, называюцца імѐны сеньѐраў і галоўных прапаведнікаў кальвінісцкага вучэння, дадаецца пералік іх твораў. На думку А. Хацеева, даследаванне Ю. Лукашэвіча з’яўляецца самым грунтоўным па тэме не толькі для свайго часу, у тым ліку на яго спасылаецца вядомы гісторык Рускай Царквы мітрапаліт Макарый (Булгакаў) [124].

Кракаўскія навукоўцы ў канцы XIX ст. таксама выдалі некалькі гістарычных твораў. Найбольш удалым з’яўляецца даследаванне Юліяна Букоўскага аб польскай Рэфармацыі [43].

У другой палове XIX – пачатку XX ст. выйшла таксама нямала работ рускіх гісторыкаў, прысвечаных пытанням Рэфармацыі, яе дзеячам і ўвогуле канфесійнай гісторыі Польшчы і Літвы ў XVI ст. Можна назваць імѐны такіх вядомых вучоных, як Мікалай Любовіч [106], Мікалай Карэеў [100], Платон Жуковіч [91], Алег Лявіцкі [105].

Польская навука ў пачатку XX ст. дала важныя даследаванні Аляксандра Брукнера [42] і Генрыха Мерчынга [63]. Але найбольш значнай была работа, якая праводзілася ў 50–60-я гг. XX ст. З’явіліся два перыядычныя выданні Reformacją w Polsce [71] и Odrodzenie i Reformacją w Polsce [65]. Выйшлі невялікія нарысы па гісторыі Рэфармацыі ў Польшчы П. Фокса і С. Кота на англійскай і французскай мовах адпаведна [46]. Былі выдадзены даследаванні па розных аспектах Рэфармацыі Януша Тазбіра [73]. З’явілася магчымасць для выдання новай абагульняючай работы па гісторыі Рэфармацыі ў ВКЛ, выкананай М. Косманам [56].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У сярэдзіне XX ст. выйшлі грунтоўныя даследаванні аб польскай рэфармацыі нямецкіх вучоных Эдварда Ёргенсэна і Готфрыда Шрама [51].

Савецкія гісторыкі разглядалі распаўсюджванне рэфармацыі на Беларусі з пункту гледжання класавай тэорыі і аднабока зразумелага гуманізму. Аб гэтым сведчаць, на наш погляд, работы М. Алексютовіча, С. Падокшына, Э. Дарашэвіча, У. Конана, С. Сокала [80]. Праца М. Дзмітрыева аб узаемаадносінах Праваслаўя і Рэфармацыі ў Рэчы Паспалітай другой паловы XVI ст., якая выдадзена ў 1990 г. у Маскве, заснавана на матэрыялах рускіх гісторыкаў XIX ст. [89].

Важкім унёскам у даследаванне рэфармацыйнага асяроддзя XVI ст. з'яўляецца зборнік артыкулаў «Белоруссия и Литва XV–XVI вв.» Уладзіміра Пічэты [115].

Найбольш поўна дзейнасць непасрэдна Берасцейскіх друкарняў распрацавана ў польскай гістарыяграфіі [92]. Агульныя працы па гісторыі рэфармацыйнага руху і кнігадрукавання ў Польшчы і ВКЛ прадстаўлены шырока вядомымі творамі Я. Гофмана [48], Ю. Бандтке [39], І. Лелявеля [60], К. Пякарскага [66], А. Кавецкай-Грычовай [55], М. Тапольскай [74–76], даведнікам «Друкары старадаўняй Польшчы» [45] і інш. Даследаванню аб жыцці і дзейнасці М. Радзівіла Чорнага, Б. Ваявудкі, С. Мурмэліуса, Ц. Базыліка прысвечаны публікацыі Я. Ясноўскага [49], Ф. Пуласкага [3; 69; 70], Я. Пташніка [68], А. Кавецкай-Грычовай [55], К. Пякарскага [66] і інш.

У беларускай гістарыяграфіі няма грунтоўных прац аб дзейнасці пратэстанцкіх друкарняў Бярэсця. Намі вылучаны некалькі публікацый, у якіх асветлены асобныя напрамкі дзейнасці гэтых устаноў. У доктарскай дысертацыі М. В. Нікалаева [112], а таксама ў апошняй яго манаграфіі [110] дзейнасць друкарняў разглядаецца ў агульным кантэксце развіцця кніжнай культуры ВКЛ. У публікацыі І. Е. Яўжэнка [90] разглядаецца прадукцыя Берасцейскіх друкарняў, якая паўплывала на распаўсюджванне рэфармацыйных ідэй сярод жыхароў Беларусі і Літвы. Л. Іванова [93–99] таксама разглядае друкаваныя выданні Бярэсця з пункту гледжання іх адносін да рэфармацыйнага руху ВКЛ. Я. Парэцкі [114] аналізуе антыкаталіцкія творы пратэстанцкіх друкарняў. І. Саверчанка [118] разглядае берасцейскія выданні ў аспекце распрацоўкі сацыяльнай дактрыны пісьменнікамі і філосафамі Беларусі ў XVI ст. Ю. Лабынцаў [104] адзін з раздзелаў манаграфіі «Пачатае Скарынам»

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прысвяціў аналізу асобных напрамкаў дзейнасці пратэстанцкіх друкароў Б. Ваявудкі, С. Мурмэліуса, Ц. Базыліка, кальвінізму М. Радзівіла Чорнага і звязаную з ім праграмна-выдавецкую палітыку віленскага ваяводы. З апошніх публікацый біяграфіі Станіслава Мурмэліуса можна назваць артыкул У. Александровіча [79]. Гістарыяграфічна-бібліяграфічны аналіз праблемы прадстаўлены ў публікацыях Т. Самайлюк і Н. Верас [85; 120]. Мастацкія асаблівасці берасцейскай Біблii разгледжаны ў артыкуле М. В. Нікалаева [111]. Нямала даследаванняў беларускіх і польскіх вучоных прысвечаны аналізу Канцыянала Яна Зарэмбы [54; 57; 58; 88; 103; 113].

Як вынікае з прадстаўленага аналізу дакументальных матэрыялаў, бібліяграфічных крыніц і навуковых публікацый, застаецца шмат пытанняў, звязаных з комплексным вывучэннем дзейнасці друкарняў. Сѐння актуальнай з'яўляецца праблема складання поўнага рэпертуару ўсѐй друкаванай прадукцыі, што выходзіла на Беларусі ў яе гістарычных межах. Для падрыхтоўкі грунтоўнага даследавання гісторыі Берасцейскіх друкарняў, рэканструкцыі іх дзейнасці ў першую чаргу неабходны выяўленне і публікацыя гістарычных дакументальных крыніц, архіўных матэрыялаў, складанне зводнага каталога выданняў друкарняў з іх паэкзэмплярным апісаннем, выданне бібліяграфічнага паказальніка публікацый па тэме.

---

**Дакументальныя крыніцы**

1. *Monumenta* Reformationis Polonicae et Lithuanicae. Zbiór pomników Reformacji kościoła polskiego i litewskiego. Zabytki z wieku XVI-go. Staraniem Synodu Jednoty Ewangielicko-Reformowanej Litewskiej. – Serja 1, zeszyt 1. Zabytki z wieku XVI-go. – Wilno, 1911 ; Serja 4, zeszyt 2. Akta synodów prowincjonalnych Jednoty Litewskiej, 1611–1625. – Wilno, 1915 ; Serja 6, zeszyt 1. Spis synodów i sesji prowincjonalnych Jednoty Litewskiej, 1611–1913. – Wilno, 1913 ; Serja 10, zeszyt 1. Akta, tho iest sprawy Zboru krześciańskiego Wileńskiego, którę sie poczęli R.P. 1557 Miesiąca Decembra Dnia 14. Ze sprawą xiędza Simona z Prossowic, tego zboru superintendenta, Kaznodzieie Oświęconego Xiążęcia pana Mikołaia Radziwiła, Woiewody Wileńskiego etc. W Brześciu Litewskim 1559. – Wilno, 1913.

2. *Zbior* pomnikow Reformacji koscioła polskiego i litewskiego. – Wilno, 1925.

3. *Collectanea* Biblioteki Ordynacji Hr. Krasińskich. Nr. 1. Katechizm brzeski 1553/1554 r. / wydał i przedmową poprzedził F. Pułaski. – Warszawa, 1908.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

4. *Akta* synodów różnowierczych w Polsce. T. 1–4 / opracowała Maria Sipayłło. – Warszawa : Wydawnictwa Uniwersytetu Warszawskiego, 1966–1997. – T. 1 : 1550–1559 ; T. 2 : 1560–1570 ; T. 3 : 1571–1632 ; T. 4 : Wielkopolska, 1569–1632.

5. *Augustyniak U.* Testamenty ewangelików reformowanych w Wielkim Księstwie Litewskim. – Warszawa : Semper, 1992. – 249, [2] s. : faks., fot., portr.

6. *Relacje* nuncjuszow apostolskich i innych osob o Polsce od roku 1548 do 1690. T. 1–2 / przygotował do druku Erazm Rykaczewski. – Berlin ; Poznan, 1864.

7. *Johannes* Calvins Lebenswerk in seinen Briefen. Eine Auswahl von Briefen Calvins in dt. / übers.v. Rudolf Schwarz ; mit einem Geleitwort von prof. D. Paul Wernle. – In 2 Bde. – Tübingen : J. Mohr, 1909. – XXII, 498 s. In 3 Bde. – 1961; *Hartleb K.* Kalwin a Polska. Stosunek do krola i moznowladcow w swietle wzajemnej korespondencji. – Lwow, 1912.

8. *Theiner A.* Vetera Monumenta Poconiae et Lithuaniae gentiumque finitimarum historiam illustrantia. T. 2–3. – Romae, 1863; *Volumena* Legum. T. 1–2. – Petersburg, 1859–1860; *Skarbec* dyplomatów papieskich, cesarskich, królewskich, książęcych i urzędów posługujących do krytycznego wyjaśnienia dziejów Litwy, Rusi Litewskiej i ościennych im krajów słuzającię / zebrał... J. Danilowicz. – Wilno, 1860. – T. 1. – 662 s.; T. 2. – 598 s.; *Акты,* относящиеся к истории Западной Руси, собранные и изданные Археографической комиссией. Т. 1–3. – Санкт-Петербург, 1846–1848; *Акты,* относящиеся к истории Южной и Западной России. Т. 1. – Санкт-Петербург, 1863 і інш.

## Бібліяграфічныя крыніцы

### *Агульныя бібліяграфічныя працы*

9. *Starowolski* Szymon (1588–1656). Simonis Starovolscii Scriptorum Polonicorum΄Εκατουτας, seu Centrum illustrium Poloniae scriptorium elogia et vitae. – Venetiis : apud haeredes Damiani Zenarii, 1627. – [12], 236, [8] p. [Frankfurt, 1625. (Збралевіч)].

10. *Sand* Christof (1644–1680). Bibliotheca anti-trinitariorum, sive Catalogus scriptorum, et succincta narratio de vita eorum auctorum, qui praeterito et hoc seculo, vulgo receptum dogma de tribus in unico Deo per omnia aequalibus personis vel impugnarunt, vel docuerunt solum Patrem D. N. J. Christi esse illum verum seu altissimum Deum / opus posthumum Christophori Chr. Sandii ; accedunt alia quaedam Scripta, quorum seriem pagina post praefationem dabit, quae omnia simul iuncta Compendium historiae ecclesiasticae unitariorum, qui sociniani vulgo audiunt, exhibent. – Freistadii [Амстердам], 1684. – [14], 296 p. Факсімільнае перавыданне было ў Польшчы ў 1967 г.

11. *Jocher Adam Benedykt.* Obraz bibliograficzno-historyczny literatury i nauk w Polsce, od wprowadzenia do niej druku po rok 1830 włącznie. – Wilno, 1840–1857. – T. 1–3.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

12. *Estreicher Karol.* Bibliografia polska. – Kraków, 1870–1951. – T. 1–34.

13. *Wierzbowski Theodorus.* Polonica XV ac XVI ss., sive Catalogus librorum res Polonicas tractantium vel a Polonis conscriptorum arte typographica impreeorum, qui in bibliotheca universitatis Caesareae Varsaviensis asservantur. – Varsoviae, 1889–1894. – T. 1–3.

14. *Bibliografia* Literatury Polskiej. Nowy Korbut. T. 1–3 : Piśmiennictwo staropolskie / oprac. zespół pod kierownictwem Romana Pollaka. – [B. m.] : Panstwowy in-t wydawniczy, 1964.

15. *Белоруссия* в печати XVI ст. : библиогр. указ. на иностр. яз. / Гос. б-ка БССР им. В. И. Ленина ; сост. М. Василевская. – Минск, 1985.

16. *Polonia* typographica. Saeculi Sedecimi : zbior podobizn zasobu drukarskiego tloczni Polskich XVI stulecia. Zeszyt IX : Maciej Wirzbieta. Krakow, k1555/7–1605. Tablice 416–475. – Wroclaw [at al] : Wydawnictwo Polskiej Akademii Nauk, 1974.

### *Каталогі бібліятэк*

### Польшча

17. *Katalog* Biblioteki Kórnickiej. T. 1 : Polonica XVI-go wieku, cz. 1 / zestawił Kazimierz Piekarski. – Kórnik ; Kraków : Nakl. Bibl. Kórnickiej, 1929. – 229 s.

18. *Katalog* druków polskich XVI w. znajdujących się w Bibliotece Towarzystwa Przyjaciół Nauk w Poznaniu / opracowali L. Dobrzynska-Rybicka, A. Koehlerowna. – Poznań, 1929.

19. *Katalog* druków polskich XVI wieku Biblioteki Kapitulnej w Gnieznie / X. L. Formanowicz. – Poznań, 1930.

20. *Katalog* Biblioteki Horynieckiej XX. Ponińskich. Część 1 : Inkunabuły i polonica XVI wieku / zestawili A. Kawecka-Gryczowa, K. Piekarski. – Warszawa, 1935.

21. *Katalog* starych druków Biblioteki Publicznej m. st. Warszawy. Cz. 2 : Polonica XVI wieku / oprac. A. Kawecka-Gryczowa. – Warszawa, 1957. – № 10, 13, 110.

22. *Katalog* druków polskich XVI wieku Biblioteki Głównej Uniwersytetu im. Adama Mickiewicza w Poznaniu / Cybertowicz J., Kowalewicz H. – Poznań, 1963.

23. *Katalog* starych druków Biblioteki Zakładu Narodowego im. Ossolińskich : Polonica wieku XVI / opracowała Maria Bohonos. – Wrocław [etc.], 1965.

24. *Katalog* starych druków Biblioteki Poznanskiego Towarzystwa Przyjaciol Nauk : Polonica XVI wieku / oprac. E. Stelmaszczyk. – Poznań, 1991.

25. *Katalog* poloników XVI w. Biblioteki Uniwersyteckiej we Wrocławiu : w 2 cz. / zestawił Jan Ożóg. – Wrocław, 1988–1991. – Cz. 1–2.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*26. Katalog* poloników XVI wieku Biblioteki Jagiellońskiej / Uniwersytet Jagielloński ; pod redakcją Mariana Malickiego i Ewy Zwinogrodzkiej ; opracowali: Małgorzata Gołuszka [et al.]. – Warszawa ; Kraków, 1992–1995. – T. 1–3.

*27. Budzyk K.* Bibliografia dzieł prawniczych Bartłomieja Groickiego – wiek XVI // Studia nad książką poświęcone pamięci Kazimierza Piekarskiego. – Wrocław, 1951. – S. 123–197 ; Studia z zakresu nauk pomocniczych i historii literatury polski. – Wrocław, 1956. – T. 1.

**Германія**

*28. Polnische* Druke und Polonica, 1501–1700 : Katalog der Herzog August Bibliothek Wolfenbüttel. Bd. 1 : 1501–1600, teil 1–2 / bearbeitet von Małgorzata Gołuszka und Marian Malicki. – München ; New York ; Paris, 1992.

**Літва**

*29. XVI–XVII a.* Lituanika Lietuvos mokslų akademijos bibliotekoje = Lithuanica saeculi sexti decimi et septimi decimi ex Bibliotheca Academiae Scientiarum Lithuaniae : katalogas / sudaré Daiva Narbutiené, Violeta Radviliené, Daliva Rauckyté-Bikauskiené. – Vilnius, 2007. – XXVII, 502 s.

*30. Early* books of Lithuania : $16^{th}$ – $18^{th}$ centuries : exhibition catalogue / Vilnius University Library. – [B. m.], 1997. – 59 p. Каталог выставы кніг з аддзела рэдкіх кніг Вільнюскага ўніверсітэта. Пад № 33 Брэсцкая Біблія.

**Швецыя**

***Упсала***

*31. Trypućko, Józef.* Polonica vetera Upsaliensia : catalogue des imprimés polonais ou concernant la Pologne des XV, XVI, XVII et XVIII siècles conservés à la Bibliothèque de l'Université Royale d'Upsala. – Uppsala, 1958.

***Гарадская бібліятэка Вестэрос***

*32. Gawryś E.* Slavica Arosiensia : catalog över slaviska handskrifter och tryck från 1500-, 1600-, och 1700-talet I stifts- och landsbiblioteket i Västerås. Bd. 1–3. – Västerås, 1956–1961; крыніца: *Катлярчук А. С.* Беларусіка XVII–XVIII стст. у зборах Швецыі // Белорусский сборник : статьи и материалы по истории и культуре Белоруссии. – Санкт-Петербург, 2005. – С. 139–143.

**ЗША**

*33. Rare* Polonica in the New York Public Library : books of $15^{th}$– $18^{th}$ centuries = Polonica XV–XVIII wieku w zbiorach Nowojorskiej Biblioteki Publicznej / edited by Marianna Czapnik with Wojciech Siemaszkiewicz ; based on materials compiled by Robert H. Davis. – New York : Norman Ross Publishing, 2001. – 227 p. – Рэц.: *Нікалаеў М.* Нашы старадрукі за акіянам // Наша Ніва. – 2001. – 3 снеж. (49). – С. 8; *Лаўрык Ю.* // Беларускі гістарычны агляд. – 2001. – Т. 8, сш. 1–2 (14–15), снежань.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*34. Early* and rare Polonica of the 15th–17th centuries in American Libraries / a bibliographical survey by Janina W. Hoskins. – Boston : G. K. Hall, 1973. – XI, 193 p.

**Беларусь**

*35. Киреева Г. В.* Брестские издания XVI века в фондах Национальной библиотеки Беларуси // Здабыткі : дакументальныя помнікі на Беларусі / Нац. б-ка Беларуси. – Мінск, 1995. – С. 24–30.

**Расія**

*36. «Литваника»* XVI–XX вв. в собрании Библиотеки Российской академии наук : каталог выставки / Савельева Е. А. [и др.]. – Санкт-Петербург, 1997. – 40 с.

*37. Собрание* польских старопечатных книг в славянском фонде БАН. Несвижская ординатская библиотека Радзивиллов. Вып. 1–2. – Санкт-Петербург, 2005.

**Публікацыі**

*38. Baliński M., Lipiński T.* Starożytna Polska pod względem historycznym, jeograficznym i statystycznym opisana. T. 1–3. – Warszawa, 1843–1846; Wyd. 2-e. T. 1–4. Warszawa, 1885–1887.

*39. Bandtkie J. S.* Historia drukarń w Królestwie Polskim i Wielkim Xięstwie Litewskim, jako i w krajach zagranicznych, w których polskie dziela wychodzily. T. 1–3. – Kraków, 1826. – T. 1. – S. 55–58, 186, 255, 431–432.

*40. Bentkowski F.* (1781–1852). Historia literatury Polskiej. T. 1–2. – Warszawa, 1814.

*41. Brückner A.* Mikołaj Rej. – Warszawa : Państ. Wydaw. Naukowe, 1988. – 193, [1] s., [2] k. tabl., [1] s. tabl. : il. – (Małe Portrety Literackie).

*42. Brückner A.* Różnowiercy polscy. Szkice obyczajowe i literackie. Ser.1. – Warszawa, 1905.

*43. Bukowski J.* (1837–1904). Dzieje reformacyi w Polsce. T. 1–2. – Kraków, 1883–1886.

*44. Chrzanowski I.* Dwa listy łacińskie, Aloizego Lipomana i Mikołaja Radziwiłła w przekładzie polskim Mikołaja Reja // Z wieku Mikołaja Reja : księga jubileuszowa, 1505–1905. – Warszawa, 1905.

*45. Drukarze* dawnej Polski od XV do XVIII wieku / oprac.: A. Kawecka-Gryczewa, K. Korotajowa, W. Kraewski. – Wrocław ; Kraków, 1959. – Z. 5. – Bazylik Cyprian. – S. 45–52; *Murmelius Stanisław.* – S. 180–187; *Wojewódka Bernard.* – S. 248–255; *Radziwiłłowska* Druk. Brześć. – S. 211–214; *Brześć Litewski.* – S. 65–66.

*46. Fox P.* The Reformation in Poland // The Cambridge history of Poland. – Cambridge, 1950; *Kot S.* La Reforme dans le Grand Duche // Institut de Philologie et d'Histoire Orientales et Slaves. – 1953. – 12.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

47. *Fries Ch.* Beitrage zur Reformationsgeschichte in Polen und Litauen. – 2 Bde. – Breslau, 1786.

48. *Hoffmann J. D.* (1701–1766). De Typographiis earumque initiis et incrementis in Regno Poloniae et M.D.Lithuaniae cum variis observationibus rem literariam et typographicam utriusque gentis alique ex parte ilustrantibus. – Dantisci [Гданьск] : apud Georgium Marcum Knochium, 1740. – 71 p.

49. *Jasnowski J.* Mikołaj Czarny Radziwiłł (1515–1565). Kanclerz i marszałek ziemski Wielkiego Księstwa Litewskiego, wojewoda Wileński. – Warszawa, 1939.

50. *Jocher A. B.* Obraz bibliograficzno-historyczny literatury i nauk w Polsce, od wprowadzenia do niej druku po rok 1830 włącznie. T. 1–3. – Wilno : Druk J. Zawadzkiego, 1840–1857. – T. 1. – 468 s.

51. *Joergensen K. E.* Ökumenische Bestrebungen unter den polnischen Protestanten. – Copenhagen, 1942; *Schramm G.* Der polnische Adel und die Reformation, 1548–1607. – Wiesbaden, 1965.

52. *Juda M.* Ochrona prawna wydawnictw reformacyjnych w Polsce w XVI–XVIII wieku // Odrodzenie i Reformacja w Polsce. – Warszawa, 1994. – T. 38.

53. *Juszyński M. H.* Dykcyonarz poetów polskich. T. l–2. – Kraków, l820. – (Repr. Warszawa Reprint. Autor: Hieronim Juszyński; wyd. Kraków 1820 w Drukarni Józefa Mateckiego (Wydawnictwa Artystyczne i Filmowe 1980 r. nakład 600 egzemplarzy, numerowanych, nr. 44).

54. *Kawecka A.* Koncjonały protestanckie na Litwie w XVI w. // Reformacja w Polsce. – Warszawa, 1926. – R. 4, № 13–16.

55. *Kawecka-Gryczewa A.* Drukarstwo polskie w dobie Odrodzenia // Bibliografia literatury polskiej okresu Odrodzenia. – Warszawa, 1954. – S. 228–273.

56. *Kosman M.* Archiwalia do dziejów reformacji i kontrreformacji w Wielkim Księstwie Litewskim: Zarys losów i stan obiecny // Archeion. – 1971. – T. 56; *Kosman M.* Badania nad reformacją w Wielkim Księstwie Litewskim // Odrodzenie i Reformacja w Polsce. – 1971. – T. 16; *Kosman M.* Reformacja i kontrreformacja w Wielkim księstwie Litewskim w świetle propagandy wyznaniowej. – Wrocław, 1973.

57. *Kot S.* Kancjonał brzeski Jana Zaręby z 1558 r. // Reformacja w Polsce. – Warszawa, 1937–1939. – T. 9–10. – S. 445–452. Унікальны асобнік Канцыянала, што захоўваўся да вайны ў Кѐнігсбергу, лічыцца страчаным.

58. *Kot S.* Nieznany poeta polski XVI wieku // Zeitschrift für Slavische Philologie. – 1956. – Bd. 25, h. 1. – S. 127–145.

59. *Lauterbach S. F.* Ariano-Socinismus olim in Polonia. – Frankfurt ; Leipzig, 1725.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*60. Lelewel J.* Bibliograficznych ksiag dwoje, w ktorych rozebrane i pomnozone zostaly dwa dziela Jerzego Samuela Bandtkie: Historia drukarn krakowskich todziez Historia Biblioteki Uniw. Jagiell. w Krakowie. – Wilno, 1823. – T. 1. – S.195–196.

*61. Lubieniecki, Stanisław* (1623–1675). Historia reformationis Polonica, in qua tum reformatorum, tum antitrinitariorum origo et progressus in Polonia et finitimis provinciis narrantur. – Freistadii [Amsterdam], 1685. – [16], 304 p.

*62. Łukaszewicz J.* Dzieje kościołów wyznania helweckiego w Litwie. T. 1–2. – Poznań : drukarnia «Orędownika», 1842–1843. – URL: www.wbc. poznan.pl:3139; *Łukaszewicz J.* Dzieje kościołów wyznania helweckiego dawnej Malej Polsce. – Poznań, 1853.

*63. Merczyng H.* Zbory i senatorowie protestancy w dawnej Rzeczypospolitej. – Warszawa, 1904.

*64. Nowak Z.* Mikołaja Reja literacka służba reformacji // Odrodzenie i Reformacja w Polsce. – Warszawa, 1970. – T. 15.

*65. Odrodzenie* i Reformacja w Polsce / Polska Akademia Nauk. Instytut Historii. – Warszawa : Państw. Wydaw. Nauk, 1956–2007. – T. 1–51.

*66. Piekarski K.* Książka w Polsce XV i XVI wieku // Kultura Staropolska. – Kraków, 1931. – S. 350–384.

*67. Piekarski K.,* Kot S. Szymon Zacjusz w Brześćiu // Reformacja w Polsce. – Warszawa, 1937–1939. – T. 9–10.

*68. Ptasnik J.* Drukarze roznowiercy w Krakowie wieku XVI // Reformacja w Polsce. – Warszawa, 1921. – T. 1.

*69. Pulaski F.* Katechizm brzeski 1553/1554 r. // Pamietnik Literacki. – 1908. – T. 7. – S. 320–344.

*70. Pulaski F.* Wiadomosci o najdawniejszych i nieznanych drukach brzeskich 1553–1554 r. // Przeglad biblioteczny. – 1908. – № 1. – S. 121–126.

*71. Reformacja* w Polsce : organ Towarzystwa do Badania Dziejów Reformacji w Polsce. R. 1–12. – Warszawa, 1921–1955.

*72. Reiss J.* Monogramy i akrostychy w religijnych pieśniach reformacji polskiej // Reformacja w Polsce. – 1921. – T. I.

*73. Tazbir J.* Propaganda kontrreformacji wśrod chłopów inflanckich // Kwartalnik Historyczny. – 1958. – № 64; *Tazbir J.* Stanisław Lubieniecki przywodca arianskiej emigracji. – Warszawa, 1961; *Tazbir J.* Panstwo bez stosow. – Warszawa, 1967 і інш. работы аўтара.

*74. Topolska M. B.* Czytelnik i książka w Wielkim Księstwie Litewskim w dobie Renesansu i Baroku. – Wrocław : Zakł. Nar. im. Ossolińskich, 1984. – 337, [2] s. : il., err. – (Książki o Książce).

*75. Topolska M. B.* Książka na Litwie i Bialorusi w latach 1553–1660 // Odrodzenie i Reformacja w Polsce. – Warszawa, 1976. – T. 21.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

76. *Topolska M. B.* Społeczeństwo i kultura w Wielkim Księstwie Litewskim od XV do XVIII wieku / Uniwersytet Zielonogórski. – Poznań : Bogucki – Wydaw. Naukowe ; Zielona Góra : dystr. Oficyna Wydawnicza Uniwersytetu Zielonogórskiego, 2002. – 448 s. : il., faks.

77. *Węgierski Andrzej* (1600–1649). Systema historico-chronologicum, ecclesiarum Slavonicarum per provincias varias, praecipue, Poloniae, Bohemiae, Lituaniae, Russiae, Prussiae, Moraviae, etc. distinctarum : libris IV. adornatum, continens historiam ecclesiasticam, a Christo rt Apostolorum tempore, ad an. Dom. MDCL / opera Adriani Regenvolscii E. P. [i.e. Andreae Węgierski]. – Trajecti ad Rhenum [Utrecht] : ex officina Johannis a Waesberge, 1652. – [9], 499, [3] p.; *Węgierski Andrzej* (1600–1649). Libri quattuor Slavoniae Reformatae. – Amsterdam, 1679. – 632 p.; *Węgierski Andrzej* (1600–1649). Libri quattuor Slavoniae Reformatae [facsimile wyd. – Amsterdam, 1679] / red. Lech Szczucki ; praefatio Janusz Tazbir. – Warszawa : PWN, 1973. – XXV, [6], 632 p.

78. *Wiszniewski M.* Historia literatury Polskiej. T. 1–10. – Kraków, 1840–1857.

79. *Александровiч У. С.* Люблінскі след у біяграфіі берасцейскага друкара Станіслава Мурмеліуса // Архіварыус : зб. навукова-папулярных паведамленняў і артыкулаў / Нац. гіст. архіў Беларусі. – Мінск, 2008. – Вып. 6. – (Серыя «Гісторыя, архівазнаўства, крыніцазнаўства»).

80. *Алексютовіч М. А.* Святло ў цемры. З гісторыі свабодамыснасці і атэізма ў Беларусі. – Мінск, 1960; *Подокшин С. А.* Реформация и общественная мысль Белоруссии и Литвы. – Минск, 1970; *Падокшын С. А.* Філасофская думка эпохі адраджэння у Беларусі. – Мінск, 1990; *Дорошевич Э., Конон В.* Очерк истории эстетической мысли Белоруссии. – Москва, 1972; *Сокол С.* Социологическая и политическая мысль в Белоруссии во второй половине XVI века. – Минск, 1974.

81. *Берасцейскія кнігазборы :* матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф. «Берасцейскія кнігазборы: праблемы і перспектывы даследавання» (Брэст, 30–31 кастрычніка 2008 г.) / Абласная бібліятэка імя М. Горкага ; склад.: А. М. Мяснянкіна, Т. С. Кавенька ; пад агул. рэд. М. В. Нікалаева. – Брэст : Паліграфіка, 2010. – 463 с.

82. *Березкина Н. Ю.* Культурно-просветительная деятельность Брестской типографии (1553–1570) // Берасцейскія кнігазборы: матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф. «Берасцейскія кнігазборы: праблемы і перспектывы даследавання» (Брэст, 30–31 кастрычніка 2008 г.). – Брэст : Паліграфіка, 2010. – С. 230–237.

83. *Бярозкіна Н. Ю.* Гісторыя кнігадрукавання Беларусі (XVI – пачатак XX ст.). – Мінск : Навука і тэхніка, 1998. – 145 с. – 2-е выд. – 2000 г.

84. *Валецкі В.* Польская нацыянальная бібліяграфія як інструмент сучасных даследаванняў у галіне літаратуры па вывучаемай праблематыцы //
РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Берасцейскія кнігазборы: матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф. «Берасцейскія кнігазборы: праблемы і перспектывы даследавання» (Брэст, 30–31 кастрычніка 2008 г.). – Брэст : Паліграфіка, 2010. – С. 22–29.

*85. Верас Н. Я.* Бібліяметрычны аналіз брэсцкага кнігадрукавання ў XVI ст. // Там жа. С. 246–253.

*86. Владимиров Л. И.* Всеобщая история книги: Древний мир. Средневековье. Возрождение. XVII век. – Москва : Книга, 1988. – 311 с.

*87. Гладышчук А. А.* Да вызначэння магчымага месца знаходжання першай беларускай друкарні на тэрыторыі сучаснага мемарыяльнага комплексу «Брэсцкая крэпасць-герой» // Берасцейскія кнігазборы: матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф. «Берасцейскія кнігазборы: праблемы і перспектывы даследавання» (Брэст, 30–31 кастрычніка 2008 г.). – Брэст : Паліграфіка, 2010. – С. 254–259.

*88. Дадзіёмава В. У.* Гісторыя музычнай культуры Беларусі ад старажытнасці да канца XVIII ст. – Мінск : Беларус. гум. адук.-культ. цэнтр, 1994.

*89. Дмитриев М. В.* Православие и Реформация: реформационные движения на восточнославянских землях Речи Посполитой во 2-й пол. XVI в. – Москва, 1990.

*90. Евженко И. Е.* Книга в реформационном движении Белоруссии и Литвы второй половины XVI века // Книга в Белоруссии / ФБ им. Я. Коласа. – Минск, 1988. – С. 68–89.

*91. Жукович П.* Кардинал Гозий и польская церковь его времени. – Санкт-Петербург, 1882.

*92. Збралевич Л. И.* Белоруссия в польской библиографии XVII – первой половине XIX в. // Книговедение в Белоруссии : сб. ст. / ФБ им. Я. Коласа. – Минск, 1977. – С. 133–148. – Библиогр.: 26 назв.

*93. Иванова Л. С.* Источники по истории Реформации в Белоруссии // Белороссика : книговедение, источники, библиография / ФБ им. Я. Коласа. – Минск, 1980. – С.81–90.

*94. Иванова Л. С.* Реформационное книгопечатание в Белоруссии во второй половине XVI – первой половине XVII в. // Из истории науки и техники Белоруссии. – Минск, 1988. – С. 61–62.

*95. Иванова Л. С.* Реформация и культурная жизнь в Белоруссии во второй половине XVI – первой половине XVII в. // Наш Радавод. – Гродно, 1991. – Кн. 3, ч. 1–3. – С. 247–253.

*96. Іванова Л.* З гісторыі рэфармацыйнага кнігадрукавання ў Беларусі (другая палова XVI – першая палова XVII ст.) // 480 год беларускага кнігадрукавання : матэрыялы трэціх Скарынаўскіх чытанняў. – Мінск : Беларус. навука, 1998. – С. 187–189. – (Беларусіка=Albaruthenica ; кн. 9).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*97. Іванова Л. С.* Роля Берасцейскай друкарні ў распаўсюджванні Рэфармацыі ў Вялікім Княстве Літоўскім // Берасцейскія кнігазборы: матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф. «Берасцейскія кнігазборы: праблемы і перспектывы даследавання» (Брэст, 30–31 кастрычніка 2008 г.). – Брэст : Паліграфіка, 2010. – С. 260–267.

*98. Іванова Л.* Рэдкі помнік рэфармацыйнай публіцыстыкі XVI ст. // Інфармацыйнае забеспячэнне навукі: праблемы, пошукі, рашэнні. Да 75-годдзя з дня заснав. ЦНБ імя Я.Коласа НАН Беларусі : [зб. навук. арт.] / НАН Беларусі, ЦНБ імя Я. Коласа. – Мінск : Красіка-Прынт, 2000. – С. 134–139. – Бібліягр. у заўвагах.

*99. Іванова Л. С.* Рэфармацыя ў Вялікім Княстве Літоўскім (другая палова XVI–XVII ст.) у працах беларускіх і польскіх медзіевістаў // Наш Радавод. – Гродно, 1994. – Кн. 6, ч. 1–3. – С. 620–632.

*100. Кареев Н.* Очерк истории реформационного движения в Польше. – Санкт-Петербург, 1886.

*101. Клімаў І.* Друкаваныя пераклады Новага Запавету польска-беларускай рэфармацыі XVI ст. / Ігар Клімаў // Скарыназнаўства. Кнігазнаўства. Літаратуразнаўства : матэрыялы 3 Міжнар. кангрэса беларусістаў «Беларуская культура ў дыялогу цывілізацый» (Мінск, 21–25 мая, 4–7 снеж. 2000 г.) / рэд. кал.: У. Конан (гал. рэд.) [і інш.] – Мінск : Беларус. кнігазбор, 2001. – С. 53–62. – (Беларусіка=Albaruthenica ; кн. 20).

*102. Клімаў І. П.* Рэфармацыя ў гісторыі літаратурных моў славян: Уклад польска-беларускага і славенска-харвацкага пратэстантызму 16 ст. / Беларус. дзярж. ун-т культуры. – Мінск, 2004. – 118 с. – Са зместу: Кніжная прадукцыя пратэстантаў; Асаблівасці пратэстанцкага кнігадруку.

*103. Костюковец Л. Ф.* Кантовая культура в Белоруссии : массовые канты-гимны, лирические канты-псальмы / Л. Ф. Костюковец. – Минск : Выш. шк., 1975. – С. 34–35.

*104. Лабынцаў Ю.* Пачатае Скарынам : беларуская друкаваная літаратура эпохі Рэнесансу / пер. з рускамоўнага арыгінала С. Шупы. – Мінск : Маст. літ., 1990. – У Бярэсці, Нясвіжы, Заслаўі... – С. 166–178.

*105. Левицкий О.* Социнианство в Польше и Юго-Западной Руси в XVI–XVII вв. // Киевская старина. – 1882. – № 4–6.

*106. Любович Н. Н.* История Реформации в Польше. Кальвинисты и антитринитарии. – Варшава, 1883; *Любович Н. Н.* Начало католической реакции и упадок реформации в Польше. – СПб., 1882; *Любович Н. Н.* Несколько документов по истории реформации в Литве из Ватиканской библиотеки / Н. Н. Любович. – Варшава, 1914.

*107. Нарбутене Д.* Ян Даниэль Гоффман о книжной культуре Великого княжества Литовского // Інфармацыйнае забеспячэнне навукі: праблемы,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пошукі, рашэнні : да 75-годдзя з дня заснав. ЦНБ імя Я. Коласа НАН Беларусі : [зб. навук. арт.] / НАН Беларусі, ЦНБ імя Я. Коласа. – Мінск : Красіка-Прынт, 2000. – С.162–168.

*108. Нарбутене Д.* Издания Брестской Радзивилловской типографии в фондах Библиотеки Литовской академии наук // Берасцейскія кнігазборы: матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф. «Берасцейскія кнігазборы: праблемы і перспектывы даследавання» (Брэст, 30–31 кастрычніка 2008 г.). – Брэст : Паліграфіка, 2010. – С. 238–245.

*109. Нікалаеў М. В.* Абразкі старажытнай кніжнай культуры Берасцейшчыны (пераважна на матэрыялах Расійскай нацыянальнай бібліятэкі ў Санкт-Пецярбургу) // Там жа. С. 281–307.

*110. Нікалаеў М. В.* Кніжная культура Вялікага Княства Літоўскага – Мінск, 2009. – 423 с. – (Гісторыя беларускай кнігі : у 2 т. ; т. 1).

*111. Нікалаеў М. В.* Шэдэўры брэсцкай друкарні // Помнікі мастацкай культуры Беларусі : новыя даследаванні. – Мінск : Навука і тэхніка, 1989. – С.144–149.

*112. Николаев Н. В.* Книжная культура Великого Княжества Литовского : автореф. дис. ...д-ра филол. наук. – Санкт-Петербург, 1997. – 39 с.

*113. Парэцкая Н.* Раннія нотадрукі на Беларусі // Полымя. – 1970. – № 8.

*114. Парэцкі Я.* Антырэлігійная сатыра Брэсцкага друкарскага двара ў XVI ст. // Беларуская літаратура. – 1979. – № 7. – С. 177–187.

*115. Пичета В. И.* Белоруссия и Литва XV–XVI вв. – Москва, 1961.

*116. Плисс В.* (протоиерей). Исторический очерк проникновения и распространения реформации в Литве и Западной Руси. – Санкт-Петербург, 1914.

*117. Подокшин С. А.* Реформация и общественная мысль Белоруссии и Литвы. – Минск, 1970.

*118. Саверчанка І.* Aurea mediocritas. Кніжна-пісьмовая культура Беларусі: Адраджэнне і ранняе барока. – Мінск : Тэхналогія, 1998. – 319 с.

*119. Саверчанка І. В.* Хрысціянскі Катэхізіс у кніжна-пісьмовай культуры ўсходніх славян эпохі Адраджэння і барока. Атрыбуцыя, паэтыка, семіѐтыка. – Мінск, 1998.

*120. Самайлюк Т. А., Верас Н. Я.* Выданні берасцейскіх друкарняў XVI ст. // Маральна-эстэтычнае выхаванне моладзі сродкамі мастацтва і літаратуры : матэрыялы Міжнар. навук. канф. (24–25 лютага 2000 г.). – Мінск : Беларус. ун-т культуры, 2000. – С. 162–167.

*121. Сліж Н., Гардзееў М.* Шляхецкія тэстаменты XVI – пачатку XVIII ст. // Гістарычны альманах.– Гародня, 2000. – Т. 3. – С. 90–110.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*122. Хотеев А.* Реформация в Беларуси XVI в. и неохаризматические чаяния [Электронный ресурс] / священник Алексий Хотеев. – URL: http://www.hramvsr.by/hoteev-reformation.php.

* * *

*123. Грушевский М.* Історія украінськоі літератури. Т. 5. Кн. 2. – Кіев, 1927. – Прим. 2 к гл. «Реформаційні імпульси».

*124. Макарий* (Булгаков М. П. ; митрополит). История Русской Церкви. Кн. 5. – Москва, 1996. – С. 180–188, 399, примеч. 327, 331.

*125. Нікалаеў М. В.* Гісторыя кніжнай культуры Беларусі: праблемы і перспектывы даследавання // Беларуская кніга ў кантэксце сусветнай кніжнай культуры : зб. навук. арт. : у 2 ч. / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск, 2006. – Ч. 1. – С. 22–33.

*126. Кірэева Г.* Да праблемы стварэння зводнага каталога беларускіх старадрукаў лацінскім шрыфтам // Скарыназнаўства. Кнігазнаўства. Літаратуразнаўства : матэрыялы 3 Міжнар. кангрэса беларусістаў «Беларуская культура ў дыялогу цывілізацый» (Мінск, 21–25 мая, 4–7 снеж. 2000 г.) / рэдкал.: У. Конан (гал. рэд.) [і інш.] – Мінск : Беларус. кнігазбор, 2001. – С. 68–72. – (Беларусіка=Albaruthenica ; кн. 20).

## Summary

*T. Samailuk.* ***The Brest printeries of the 16th century: the source study and historiographic aspects***

For the preparation of a detailed study of the history of Brest printing presses, the reconstruction of their activities, first it is necessary to identify and to public the historical documentary sources, archival materials, to compose a consolidated catalog of the printing presses publications with a description of each instance, to publish a bibliographic index of publications on the subject. The article presents an overview of accumulated publications of the documental sources on the history of the Reformation movement, from which you can select information about the activities of Brest printing presses, library and collection catalogues, in which the Brest publications instances are reflected, as well as information about publications of scientific research on the topic for the duration of their existence.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ